*Ю.Д.ПЯРСІДСКАЯ*

# МАГНАЦКІЯ СЯДЗІБЫ ЯК ЦЭНТРЫ РАЗВІЦЦЯ СВЕЦКАГА ПРАФЕСІЙНАГА МАСТАЦТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XVI–XVII стст.: ГІСТОРЫКА-КАМПАРАТЫВІСЦКАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ

*Магнацкія рэзідэнцыі ў XVI–XVII стст. з'яўляліся асноўнымі цэнтрамі развіцця свецкай культуры і фарміравання прафесіяналізму ў галіне розных відаў мастацтва – музычнага, тэатральнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога. Пры дапамозе гісторыка-кампаратывісцкага агляду прадстаўлена агульная карціна мастацкага жыцця магнацкіх сядзібаў на тэрыторыі Беларусі ў адзначаны перыяд.*

Вывучэнню мастацкага жыцця арыстакратычных сядзіб і творчай дзейнасці прадстаўнікоў магнацкіх родаў прысвечаны шэраг даследаванняў. Так, пытанні музычнага жыцця ў арыстакратычных сядзібах асвятляліся ў працах В.Дадзіёмавай ("Гісторыя музычнай культуры Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст.", 1994; "Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі", 2000). Да праблем станаўлення і развіцця прыватнаўласніцкіх тэатраў на тэрыторыі Беларусі звяртаўся беларускі навуковец Г.Барышаў (у калектыўнай працы "Гісторыя беларускага тэатра", 1983; "Театральная культура Белоруссии XVIII века", 1992). Пытанні літаратурнага і выдавецкага мецэнацтва на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVII стст. асвятляюцца ў працах даследчыка Г.Галенчанкі. Мастацкай і мецэнацкай дзейнасці прадстаўнікоў знатнага роду Радзівілаў прысвячаліся навуковыя канферэнцыі ("Музы Нясвіжа", 1994, 2000, 2004), калектыўныя працы ("Нясвіжскія зборы Радзівілаў", 2002 і інш.). Аднак нявырашанай застаецца праблема комплекснага разгляду мастацкага жыцця ў магнацкіх сядзібах XVI–XVII стст., для якога было характэрна бытаванне тэатральнага, музычнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў цеснай узаемасувязі.

Асноўнай мэтай артыкула з'яўляецца рэканструкцыя разгорнутай карціны мастацкага жыцця прывілеяванага саслоўя ў XVI–XVII стст. пры дапамозе гісторыка-кампаратывісцкага агляду функцыянавання розных відаў мастацтва ў побыце магнатэрыі.

Дынаміка развіцця мастацкага жыцця беларускай арыстакратыі ў XVI–XVII стст. (як і ўсяго беларускага насельніцтва) адбывалася ў складаных сацыяльна-гістарычных умовах і залежала ад шэрага фактараў: дзяржаўнага, палітычнага, рэлігійнага, мастацка-культурнага. На працягу XVI–XVII стст. на тэрыторыі Беларусі назіралася актыўная дзейнасць розных хрысціянскіх канфесій (праваслаўя, каталіцызму, пратэстантызму, уніяцтва), якія выкарыстоўвалі музычнае, тэатральнае, выяўленчае мастацтва ў якасці сродкаў эмацыянальнага ўздзеяння на вернікаў не толькі ў сценах храма, але і ў пазахрамавых паралітургічных акцыях. Канфесіянальная арыентацыя магнатэрыі, якая суправаджалася пераходам прадстаўнікоў многіх магнацкіх родаў у каталіцызм, пратэстантызм, уніяцтва (у залежнасці ад палітычнай сітуацыі ў краіне), садзейнічала пранікненню ў яе побыт заходнееўрапейскіх культурных каштоўнасцей. Нягледзячы на тое, што мастацкае жыццё ўсяго насельніцтва Беларусі было звязана пераважна з культавай сферай, у перыяд XVI–XVII стст. адбываўся працэс секулярызацыі мастацкага жыцця беларускага грамадства. Перш за ўсё гэта праяўлялася ў жыцці шэрага магнацкіх сядзіб, якія з'яўляліся асноўнымі цэнтрамі развіцця свецкай культуры.

Мастацкае жыццё ў сядзібах беларускай арыстакратыі ў XVI–XVII стст. было досыць насычаным па сваім змесце. Многія прадстаўнікі арыстакратычнага саслоўя былі высокаадукаванымі людзьмі і накіроўвалі свае сродкі на стварэнне друкарняў, бібліятэк, калекцыяніраванне жывапісных палотнаў і прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У перыяд XVI–XVII стст. магнацкія рэзідэнцыі з'яўляліся асноўнымі цэнтрамі развіцця свецкага прафесійнага мастацтва – музычнага, тэатральнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога.

Прадстаўнікі знакамітых арыстакратычных родаў, у прыватнасці Радзівілаў і Астрожскіх, збіралі ў сценах сваіх маёнткаў прафесійных спевакоў і інструменталістаў, якія навучалі выканальніцкаму майстэрству прыдворных музыкантаў. У адрозненне ад польскіх арыстакратаў, што былі часта занятыя індывідуальнай кар'ерай на дзяржаўнай службе, даволі рэдка займаліся арганізацыяй музычнага жыцця ў сваіх палацах, беларускія магнаты праз шэраг пакаленняў захоўвалі рэпрэзентатыўныя двары з багатым музычным афармленнем [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І сапраўды, толькі ў Мікалая Радзівіла Чорнага служылі каля сотні музыкантаў, і, дзякуючы пастаяннаму клопату магната, у рэзідэнцыю запрашаліся лепшыя музычныя дзеячы таго часу [2]. У канцы XVII стагоддзя капэла існавала і ў мінскага ваяводы Крыштафа Завішы. Па меркаванні даследчыкаў, у ёй працавалі мясцовыя і замежныя музыканты, у яго палацы часта можна было пачуць французскіх вакалістаў Рэнана і Боргарда, якім акампаніраваў мясцовы лютніст Балінскі [3].

Прыдворныя капэлы заўсёды ўдзельнічалі ў сустрэчы ганаровых і паважаных гасцей. Вядома, што віленскі аркестр і хор Мікалая Чорнага аказалі вялікае ўражанне на англійскага пасла, сэра Джэрома Гарзея, падчас наведвання апошнім Вільні ў 1583 г. Спачатку пасол прысутнічаў на свяшчэннай службе ў пратэстанцкай царкве, дзе гучалі псальмы і песні. Потым пасла запрасілі на абед у вялікую трапезную залу, там былі "... арганы і спевы... пасля загучалі трубы і загрукаталі металічныя барабаны. Першы слуга ўвёў блазнаў і паэтаў, якія гаварылі жартаўлівыя рэчы..." [4, с. 22].

Аб прафесіяналізме выканаўства прыватнаўласніцкіх капэл можна меркаваць па захаваных звестках, у якіх сустракаюцца ацэнкі і апісваюцца ўражанні непасрэдных удзельнікаў урачыстасцей. Вышэйзгаданы Джэром Гарзей асабліва адзначаў майстэрства музыкантаў Радзівіла Чорнага, якія "...вельмі музыкальна зайгралі на гучных інструментах... і гучанне іх было незвычайна *мяккім і пяшчотным...*" [курсіў наш. – *Ю.П.;* 5, с.22].

Дарэчы, некаторыя прадстаўнікі прывілеяванага саслоўя нярэдка самі паказвалі сваё выканальніцкае майстэрства. Каралева Бона Сфорца даволі бегла грала на розных музычных інструментах, а згаданы вышэй мінскі ваявода Крыштаф Завіша вельмі нядрэнна валодаў лютняй. Вялікі аматар музыкі Альберт Радзівіл наогул любіў іграць на аргане, які падарыў віленскаму езуіцкаму касцёлу св.Яна [6].

Акрамя своеасаблівых музычных "канцэртаў", у сценах магнацкіх сядзіб адбываліся тэатралізаваныя паказы. Ужо з апошняй чвэрці XVI ст. прадстаўнікі вышэйшага саслоўя выпісвалі да сябе акцёраў з-за мяжы, якія жылі пры двары і забаўлялі гасцей уладара палаца. Арыстакратычныя колы асабліва ахвотна запрашалі італьянскіх акцёраў. З аднаго боку, гэтая традыцыя засталася з часоў Жыгімонта І, калі заканадаўцам прыдворнай моды была каралева Бона Сфорца. З другога – італьянскі тэатр набыў элітарны характар і славіўся надзвычайнай пышнасцю, паколькі менавіта тэатральныя прадстаўленні сталі найлепшай формай рэпрэзентацыі багацця і магутнасці знаці, што, несумненна, імкнулася паказаць і магнатэрыя Вялікага княства Літоўскага. Даследчык А.Весялоўскі адзначае, што кароль Уладзіслаў IV (гады праўлення 1632–1648) адзін з першых выпісаў да сябе ў Варшаву трупу італьянскіх спевакоў, якія заўсёды маглі прадставіць "...любую п'есу... са спяваннем, танцамі і пышным спектаклем" [7, с. 284].

Аднак у архіўных крыніцах сустракаюцца звесткі і аб тым, што тэатралізаваныя прадстаўленні акцёраў з Італіі праводзіліся на тэрыторыі Беларусі значна раней. У падарожным дзённіку Генрыха Вольфа, што паходзіў з Цюрыха і некалькі гадоў працаваў у Рэчы Паспалітай у якасці дамашняга настаўніка, ёсць запісы аб некаторых фактах, якія адлюстроўваюць характар мастацкага жыцця вышэйшага саслоўя. Так, 11 лістапада 1573 г. запісана, што да земскага суддзі Пятра Паткоўскага "...прыехалі італьянскія акцёры пана маршалка Радзівіла і пад наглядам пана практыкаваліся, каб у масках выступіць на вяселлі Паткоўскага" [8]. На жаль, засталося невядомым, што было паказана ганаровым гледачам, але відавочна, што ўжо ў канцы XVI ст. у магнацкім асяроддзі закладваліся перадумовы для ўзнікнення знакамітых магнацкіх тэатраў, якімі пазней вызначаліся шматлікія арыстакратычныя рэзідэнцыі.

Менавіта тэатралізаваныя паказы станавіліся галоўнай забавай у прыватным жыцці магнатаў. Несумненна, гэта не былі шматактныя драмы ці дыялогі. У сценах палацаў і замкаў замежныя акцёры прадстаўлялі камедыйныя ці пастаральныя сцэны. Больш за тое, некаторыя прадстаўнікі магнацкіх родаў асабіста займаліся арганізацыяй і пастаноўкай забаўляльных паказаў. Так, вядома, што ў рэзідэнцыі Радзівіла ў другой палове XVII ст. служылі акцёры італьянскага паходжання, аб чым сведчыць рукапіс ананімнага аўтара "Opery i komedye różne po włosku" ("Розныя оперы і камедыі па-італьянску"), які знаходзіўся ў бібліятэцы магната [9]. Рукапіс змяшчае дзве камедыі. У змесце адной з іх праслаўляецца міласць мужа Дона Петра рэ Д'Арагона (хутчэй за ўсё да сваёй няверная жонкі. – *Ю.П.* ). Паколькі камедыі былі старанна перапісаны, можна меркаваць, што яны неаднаразова выкарыстоўваліся і ставіліся хутчэй за ўсё трупай італьянскіх акцёраў. Відавочна, што ў адзначаны перыяд у рэзідэнцыях вышэйшага саслоўя з'яўляюцца тэатральныя залы, дзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распаўсюджваюцца тэатралізаваныя паказы, у першую чаргу забаўляльнага характару, прызначаныя для знаці.

Адначасова магнацкія сядзібы з'яўляліся і своеасаблівымі прататыпамі сучасных музеяў, паколькі ў іх захоўваліся рарытэты, антычныя рэчы, творы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва [10]. У Крыштофа Радзівіла Сіроткі была "Кунсткамера", што знаходзілася ў Любчанскай рэзідэнцыі. Яна складалася з навуковых інструментаў, рэчаў этнаграфічнага і геалагічнага характару. Большасць экспанатаў былі размешчаны на шасці вялікіх сталах, па некалькі дзесяткаў прадметаў на кожным, а таксама непасрэдна на падлозе. Сцены былі ўпрыгожаны індыйскімі абразамі, рымскімі лямпамі, азіяцкімі тканінамі, клыкамі алігатараў. Магнат праяўляў вялікую цікавасць да вырабаў са слановай косці, якімі аздабляў інтэр'ер свайго палаца. Пры гэтым Сіротка імкнуўся набыць менавіта неапрацаваную косць (хаця знайсці яе было вельмі цяжка), каб мець магчымасць заказаць рамеснікам вырабіць з яе пэўную рэч. Радзівіл таксама быў вялікім прыхільнікам прадметаў мастацтва антычных часоў. Сваім слугам і сябрам загадваў набываць антычныя рэчы на рынках Венецыі і Рыма (у асноўным гэта была біжутэрыя).

Калі ў XVI – першай палове XVII ст. некаторыя арыстакраты проста збіралі экзатычныя рэчы, то ўжо з другой паловы XVII ст. магнаты наладжваюць сувязі з замежнымі знаўцамі антычнасці і ў адпаведнасці з іх парадамі камплектуюць свае калекцыі. Напрыклад, Януш Радзівіл атрымаў у 1641 г. ад князя Вішнявецкага нейкі прадмет мастацтва са срэбра, які паслаў свайму брату Багуславу, каб той даведаўся аб яго сапраўднай каштоўнасці ў замежных антыквараў [11].

Калекцыяніраванне ў сучасным сэнсе гэтага слова таксама зарадзілася ў залах магнацкіх сядзіб. Вядома, што пры каралеўскім двары Жыгімонта I Старога і яго сына Жыгімонта II Аўгуста існавала вялікая калекцыя твораў жывапісу Джуліа Рамана, Карэджа, Лукаса Кранаха Старэйшага, Дзюрэра, мастакоў школы Тыцыяна. У XVII ст. сярод магнатэрыі было вельмі распаўсюджана заказваць замежным мастакам фамільныя партрэты, з якіх складалі знакамітыя партрэтныя галерэі. Так, Януш Радзівіл у 1651 г. запрасіў у сваю рэзідэнцыю Абрахама ван Вестэрвельда (мастака з Ратэрдама), нярэдка партрэтаваўся ў Даніэля Шульца; Багуслаў Радзівіл устанавіў сувязі з Лукацам Варстэрманам, антверпенскім мастаком з асяроддзя Рубенса. Адной з багацейшых з'яўлялася нясвіжская карцінная галерэя, сабраная Крыштофам Радзівілам Сіроткам. У яе ўваходзілі партрэты саміх Радзівілаў і прадстаўнікоў іх роду, манархаў, таксама сустракаліся выявы духоўных асоб.

Запрашэнне магнатамі ў свае рэзідэнцыі замежных майстроў, а таксама набыццё твораў вядомых мастакоў непазбежна паўплывалі на прафесійны рост мясцовых мастакоў. Так, у калекцыю галерэі ў Нясвіжы трапілі карціны, выкананыя прыдворнымі партрэтыстамі Ежы Стокам, Янам Шронерам, Францішкам.

Акрамя партрэтаў, галерэі папаўняліся карцінамі на рэлігійныя, міфалагічныя сюжэты. Так, у калекцыі Людвікі Караліны, дачкі Багуслава Радзівіла, знаходзіліся дваццаць чатыры творы вядомага мастака Лукаса Кранаха. Па меркаванні даследчыкаў, некаторыя з работ Кранаха былі набыты Мікалаем Радзівілам Чорным, паколькі апошні быў вялікім прыхільнікам таленту мастака і неаднаразова заказваў сабе габелены з выявамі яго знакамітых карцін [12].

Пры дапамозе комплекснага агляду прадстаўлена карціна мастацкага жыцця магнацкіх сядзіб Беларусі ў XVI–XVII стст. У адпаведнасці з ёй можна сцвярджаць, што мастацкае жыццё магнатэрыі ў адзначаны перыяд было досыць насычаным і разнастайным па сваім змесце, а функцыянаванне ў ім розных відаў мастацтва разгортвалася стадыяльна і неаднародна. Логіка бытавання і развіцця пэўных культурных з'яў у мастацкім жыцці магнацкіх сядзіб залежала ад шэрага фактараў: канфесіянальнага, палітычнага, эканамічнага.

У XVI ст. адбываецца секулярызацыя мастацкага жыцця беларускага грамадства, што найперш за ўсё праявілася ў разгортванні свецкіх формаў музіцыравання ў арыстакратычным асяроддзі. Пераход магнатаў у каталіцызм, пратэстантызм, уніяцтва садзейнічаў засваенню імі заходнееўрапейскіх музычных каштоўнасцей. У колах арыстакратыі ўзрастае цікавасць да інструментальнай музыкі, што, у сваю чаргу, спрыяла ўзнікненню прыватнаўласніцкіх капэл.

Арганізацыя рознымі канфесіямі школьных прадстаўленняў, паратэатральных відовішчаў садзейнічала ўкараненню тэатральнага мастацтва ў жыццё беларускага грамадства, і ў першую чаргу арыстакратычных колаў. Палітычная арыентацыя магнатэрыі на каралеўскі двор (дзе ў XVI ст. панавала італьянская мода), а таксама непасрэдныя сувязі арыстакратаў з заходнееўрапейскімі краінамі паспрыялі запрашэнню ў магнацкія рэзідэнцыі акцёраў з-за мяжы і арганізацыі ў сценах сядзіб тэатральных калектываў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У XVII ст. склаліся неспрыяльныя палітычныя і эканамічныя ўмовы для развіцця музычнага і тэатральнага жыцця ў асяроддзі магнацкіх сядзіб. Падчас няспынных войн Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай магнаты імкнуліся ўвекавечыць памяць аб сабе і сваіх продках і заказвалі асабістыя партрэты, а таксама партрэты прадстаўнікоў з іх роду, манархаў, духоўных асоб. У сценах магнацкіх рэзідэнцый паступова фарміруюцца карцінныя галерэі. Трывалыя кантакты з заходнееўрапейскімі мастакамі, якія партрэтавалі прадстаўнікоў беларускіх магнацкіх родаў, палітычныя сувязі арыстакратыі з заходнееўрапейскімі краінамі (Італіяй, Германіяй, Галандыяй) спрыялі фарміраванню ўласных каштоўнасных арыенціраў і мастацкіх густаў магнатаў. Прыватнаўласніцкія калекцыі папаўняюцца творамі на рэлігійную, міфалагічную тэматыку вядомых заходнееўрапейскіх майстроў, а таксама карцінамі невядомых галандскіх, фламандскіх, нідэрландскіх аўтараў (часцей за ўсё гэта былі нацюрморты, пейзажы, выявы замкаў і палацаў, пастаральныя сцэны).

Такім чынам, магнацкія рэзідэнцыі на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVII стст. з'яўляліся асноўнымі цэнтрамі развіцця свецкай культуры і садзейнічалі фарміраванню прафесіяналізму ў галіне розных відаў мастацтва – музычнага, тэатральнага, выяўленчага.


1. *Morawska, K.* Historia muzyki polskiej: 5t. / K.Morawska. – Warszawa: Wydawnictwo Sutkowski Edition, 1994. – T. 2. Renesans; 1500–1600. – 413 s.

2. *Morawska, K.* Названае выданне.

3. *Дадзіёмава, В.У.* Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.У.Дадзіёмава. – Мн.: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2000. – 256 с.

4. *Пікарда, Гай дэ.* Царкоўная музыка на Беларусі, 989–1995 / Гай дэ Пікарда. – Мн.: ТЭКСАРТ, 1995. – 67 с.

5. *Пікарда, Гай дэ.* Названае выданне.

6. *Ліхач, Т.* Арганы і званы каталіцкіх касьцёлаў Беларусі XVII–XVIII стст. / Т. Ліхач // Музыка. – 1995. – №4. – С. 68–71.

7. *Веселовский, А.* Старинный театр в Европе / А. Веселовский. – М.: Типография П.Бахметева, 1870. – 410 с.

8. *Белы, А.* Пэрэгрынацыі, або Кароткае і сціслае апісанне вандраванняў Генрыха Вольфа з Цюрыху: дзённік падарожжа 1570–1578гг. / А.Белы // Сайт "История Беларуси IX–XVIII веков. Первоисточники". – Рэжым доступу: http://starbel.narod.ru/wolf.htm. – Дата доступу: 24.05.2006.

9. *Biblioteka* Narodowa. Sygn. 6799. Arhiwum Radziwiłłów z Nieświeża.

10. *Лазука, Б.А.* Беларускае барока: гіст.-тэарэтыч. праблемы стылю / Б.А.Лазука. – Мн.: Беларусь, 2001. – 144с.: іл.

11. *Sulerzyska, T.* Galerie obrazów i "gabinety sztuki" Radziwiłłów w XVII w. / T.Sulerzyska // Biuletyn Historii sztuki. – 1961. – № 2. – S. 87–97.

12. *Sulerzyska, T.* Названае выданне.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ